# Падрыхтоўка патрыётаў, вырашэнне важных задач

## Якія пытанні ўздымаліся падчас пленума ДТСААФ

**Учора ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў III пленум Цэнтральнага савета ДТСААФ. У рабоце пленума ўзялі ўдзел дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнант Аляксандр Вальфовіч, міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Віктар Хрэнін, намеснік міністра абароны па ўзбраенні генерал-маёр Андрэй Федзін, старшыня Цэнтральнага савета ДТСААФ генерал-маёр запасу Андрэй Някрашэвіч.**

Як адзначыў **дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ,** ДТСААФ сёння з'яўляецца грамадскай дзяржаўнай арганізацыяй, якая ўпэўнена займае сваю нішу ў сістэме нацыянальнай бяспекі нашай краіны. «Гэта структура іграе найважнейшую ролю ў выхаванні нашага падрастаючага пакалення. На ДТСААФ ускладзена рашэнне дзяржаўна значных задач па падрыхтоўцы насельніцтва да абароны нашай краіны, самы непасрэдны ўдзел у грамадзянска-патрыятычным выхаванні нашых грамадзян, развіцці тэхнічных, авіяцыйных, ваенна-прыкладных відаў спорту, тэхнічнай творчасці моладзі», — сказаў ён.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў, што абстаноўка вакол краіны сёння сапраўды вельмі складаная і напружаная: «Вы ўсе абсалютна правільна падрыхтаваныя і дарослыя людзі выдатна бачыце, што адбываецца. Развязана гібрыдная вайна, якая нясе новыя пагрозы і выклікі, што адкладаюць свой адбітак, уплываюць і пагражаюць нашым нацыянальным інтарэсам. Таму вельмі важна ў кожнай структуры нішы забеспячэння нацыянальнай бяспекі заняць сваё месца і процідзейнічаць гэтым пагрозам».

Па яго словах, структурай ДТСААФ было зроблена шмат станоўчага. «У апошні час зроблены велізарны крок па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Гэта вельмі важны кірунак. Прыемна, што мерапрыемствы ў гэтай сферы праводзяцца не «для галачкі», не толькі па знакавых датах. Гэтая работа стала паўсядзённай дзейнасцю арганізацыі ва ўсіх рэгіёнах краіны. Так сённяі павінна быць», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Вальфовіч. «Прэзідэнт сказаў, што ДТСААФ і структуры ваеннай арганізацыі дзяржавы павінны працаваць разам. ДТСААФ павінна цалкам уліцца ў сістэму забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Павінна быць больш шчыльнае ўзаемадзеянне з Міністэрствам абароны і іншымі структурамі сілавога блока краіны», — падагульніў ён.

У сваю чаргу старшыня Цэнтральнага савета ДТСААФ, генерал-маёр запасу Андрэй Някрашэвіч распавёў пра асаблівасці падрыхтоўкі спецыялістаў на базе ДТСААФ для Узброеных Сіл: «ДТСААФ традыцыйна працягвае навучаць кіроўцаў у інтарэсах Узброеных Сіл і іншых сілавых структур. Мы рыхтуем лётчыкаў: як ваенных, так і грамадзянскіх. Нешматлікія з краін могуць пахваліцца, што самастойна могуць навучаць лётчыкаў. У верасні мы плануем адкрыць наш спартыўна-парашютны цэнтр на базе Мінскага аэраклуба. Гэта будзе знакавая падзея не толькі для супрацоўнікаў ДТСААФ і жыхароў горада Мінска, але і для грамадзян усёй краіны».

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# «БЕЗ ДАПАМОГІ ВАЙСКОЎЦАЎ БЫЛО Б НАШМАТ СКЛАДАНЕЙ»

### За штурвалам трактара

Зводны ўзвод вайскоўцаў, які аказвае дапамогу ў сельгасработах аграрыям Рэчыцкага раёна, размясціўся непасрэдна ў райцэнтры. Раніцай з горада байцы выязджаюць у гаспадаркі, за якімі замацаваны. Заступаюць на службу з васьмі гадзін. У іх адладжаны працэс выхаду на змену: на мехдварах агляд-падрыхтоўка машын і трактароў, запраўка. Перад выездам на працу ў поле для байцоў — невялікая «планёрка»: кіраўнікі сельгаспрадпрыемства ставяць задачы на дзень. Цяпер у гаспадарках вайскоўцы задзейнічаны на ўборцы з палёў саломы, выконваюць транспарціроўку збожжа на зернесушыльных комплексах і дапамагаюць у працэсе сушкі зерня перад яго адпраўкай у сховішча.

У полі КСУП «Дзяржынскі-Агра» Рэчыцкага раёна за штурвалам трактара — вайсковец Мацвей Саракач. Хлопец сам родам са Смалявіч. Служыць па кантракце ў 127-й гвардзейскай брыгадзе сувязі.



Праца на зернетаку КСУП «Дземяхоўскае».

— Служу толькі чацвёрты месяц. Па грамадзянскай спецыяльнасці я трактарыст. Да прызыву ў войска адвучыўся на кіроўцу-слесара. Праходзіў адпрацоўку ў сельгаспрадпрыпрыемстве ў сваім родным раёне. Працаваў слесарам па рамонце аўтамабіляў і сельгастэхнікі, — распавёў Мацвей.

У КСУП «Дзяржынскі-Агра» вайсковец цяпер задзейнічаны на перавозцы саломы.

— Пагрузчык запоўняе прычэп, і мая задача перавезці ўжо салому на месца захоўвання. За дзень прыкладна 100 цюкоў перавожу. Падабаецца, што працуеш у цішыні, і спакой на прыродзе, — дадаў малады чалавек.

### Важны этап

Уборка саломы з палёў, якую выконваюць зараз байцы, — вельмі важны этап ва ўборачна-пасяўной кампаніі. Цяпер, пасля жніва, якраз час сяўбы азімых культур. Пакуль з палёў не вывезлі салому, немагчыма падрыхтаваць неабходныя плошчы для сяўбы.

— Без дапамогі вайскоўцаў нам было б нашмат складаней справіцца з гэтым этапам сельгасработ у тэрмін, — пацвярджае **дырэктар КСУП «Дземяхоўскае» Рэчыцкага раёна Іван АНІСАВЕЦ.** У яго гаспадарцы таксама на службу заступілі вайскоўцы. — Байцы — гэта і дадатковыя працоўныя рукі, а таксама і добрая магутная тэхніка.



Кіраўнік КСУП «Дземяхоўскае» Іван АНІСАВЕЦ і старшы зводнага ўзводу на ўборцы ўраджаю ў Рэчыцкім раёне Віталь МАКСІМЕНКА з вайскоўцамі на пачатку працоўнай змены.

Як распавёў дырэктар КСУП «Дземяхоўскае», у гаспадарцы збожжавых, зернебабовых — каля дзвюх тысяч гектараў — ужо поўнасцю ўбралі з палёў. Цяпер галоўны клопат — дапрацаваць збожжа, апрацаваць насенне і падрыхтавацца да ўборкі кукурузы на зерне і сілас.

— Паралельна пачалі сяўбу азімага рапсу. Закладваем будучы ўраджай. Ваеннаслужачыя нам вельмі дапамаглі. Такая аперацыя, як звоз саломы з-за недахопу тэхнікі і людзей у нас практычна поўнасцю прастойвала. Дзякуючы дапамозе байцоў пад пасеў рапсу мы поўнасцю вызвалілі палі ад саломы. Плюс у нас два салдаты задзейнічаны на сушыльным комплексе ў якасці аператараў на дасушцы збожжа. Мы іх навучылі, працуюць яны ў звязцы з нашым мясцовым дасведчаным работнікам.

Плюс дзве адзінкі ваеннай тэхнікі на адвозцы збожжа ад камбайнаў — таксама вельмі вялікая падтрымка. Мы павялічылі тэмпы ўборкі дзякуючы гэтаму намнога, — адзначыў Іван Анісавец.

### Праца са збожжам

«Прынялі іх як самых родных»: так пра гэтыя дні агульнай работы з байцамі расказваюць працаўнікі гаспадарак Рэчыцкага раёна. Для многіх у працоўным вопыце гэта першая такая практыка і каласальная дапамога ў рабоце.

На зернетаку аддзялення Міляград КСУП «Дземяхоўскае» на транспарціроўцы збожжа працуе кіроўца батальёна матэрыяльнага забеспячэння 19-й гвардзейскай брыгады Аляксандр Папко. Ён прыехаў на Гомельшчыну з Віцебшчыны. Больш за 30 гадоў Аляксандр Аляксеевіч працуе кіроўцам у арміі. Спачатку ў пошукавым батальёне, а вось апошнія 20 гадоў — за рулём МАЗа ў батальёне матэрыяльнага забеспячэння.

— За час службы не раз даводзілася адпраўляцца ў камандзіроўкі на дапамогу працаўнікам гаспадарак у сваім рэгіёне, але на Гомельшчыне — упершыню. Трэба ж дапамагаць, вядома, каб з хлебам людзі былі, — перакананы Аляксандр Папко.

На дасушцы збожжа ў гэтым аддзяленні задзейнічаны Канстанцін Будзько. Хлопец з Баранавіч. Праходзіць службу па кантракце ў 85 брыгадзе сувязі.

— Адслужыў ужо больш за паўтара года і яшчэ па кантракце крыху менш за паўгода засталося служыць. Па грамадзянскай спецыяльнасці я тэхнік-механік. Да войска дзевяць месяцаў працаваў у гаспадарцы майстрам-наладчыкам, — распавёў вайсковец. — Тут на зернетаку наша задача — дапамога ў загрузцы збожжа, якое ідзе на сушыльны комплекс.

Працуе ў звязцы з байцом з Баранавіч і Уладзіслаў Гурын. Малады чалавек праходзіць службу па кантракце ў 740 зенітна-ракетным палку.

— У гаспадарцы працаваць даводзілася ў сваім родным раёне. Пасля школы атрымаў спецыяльнасць трактарыста-машыніста, быў на вытворчай практыцы і адпрацоўцы ў сельгасарганізацыі. Так што да фізічнай працы прывычны, — распавёў хлопец.

Усе байцы, з якімі сустрэліся, падзяліліся, што іх вельмі добра прынялі ў калектывах. Вайскоўцы знаходзяцца на поўным забеспячэнні: снедаюць у раённым цэнтры, гарачыя абед і вячэру ім прывозяць непасрэдна на месца працы.



Гарачы абед на месцы працы для вайскоўцаў і аграрыяў гаспадарак.

— Умовы пражывання добрыя. У рабоце дні ляцяць як імгненне, — распавёў салдат тэрміновай службы 30 чыгуначнай брыгады Дзмітрый Кетрыс.

Хлопец у войску дзевяць месяцаў. Размеркаваны ён у філіял «Советская Белоруссия» ААТ «Рэчыцкі камбінат хлебапрадуктаў».

— Сам родам з Ашмян. Па спецыяльнасці — майстар вытворчага навучання. Падчас вучобы ў каледжы і цяпер у арміі атрымаў катэгорыі кіравання на трактары. Пакуль задзейнічаны на адвозцы саломы на трактары, але змагу працаваць і на ўспашцы, бо ўжо будзем у гаспадарцы рыхтаваць поле пад ворыва, — распавёў баец.

### Вопыт ёсць

У цэлым у зводным узводзе вайскоўцаў, якія працуюць у гаспадарках Рэчыцкага раёна, — 26 чалавек. Гэта ваеннаслужачыя, якія прадстаўляюць розныя роды войскаў, вайсковыя часці з Мінска, Наваполацка, Слуцка, Гродна, Барысава, Старых Дарог і іншых гарадоў краіны.

— Сфарміравалі 5 экіпажаў, якія выязджаюць на дапамогу ў гаспадаркі, размешчаныя на тэрыторыі раёна. У рабоце задзейнічаны 10 нашых грузавых машын, — адзначыў **старшы на ўборцы ўраджаю ў Рэчыцкім раёне, гвардыі старшы лейтэнант 6 асобнай механізаванай брыгады Віталь МАКСІМЕНКА.**

— У раён на дапамогу аграрыям прыехалі байцы, якія праходзяць службу па кантракце, тэрміновую службу, і грамадзянскія асобы. Гэта кіроўцы «Уралаў», «КАМАЗаў», «МАЗаў», самазвалаў, якія праходзяць службу ў арміі, трактарысты-камбайнеры па грамадзянскіх спецыяльнасцях. Адбіралі вайскоўцаў, якія ўжо маюць вопыт працы ў гаспадарках. Працуем ужо другі тыдзень. Змены з васьмі раніцы да шасці-сямі вечара, — дадаў Віталь Максіменка.

Размеркаваны байцы на працу ў пяць гаспадарак Рэчыцкага раёна. Плануецца, што вайскоўцы працягнуць дапамагаць аграрыям раёна ў сельгасработах яшчэ на працягу верасня.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*